Кветка перамог ці кветка шчасця?

1:8 — найлепшы іграві фільм і самы адзначаны лаўрэат першай Нацыянальнай кінапрэміі Беларусі

Але якія могуць быць падлікі? Усё толькі пачынаецца... Прыкладна такі настрой панаваў у Доме кіно 17 снежня. Дата сімвалічная і шчаслівая: дзень нараджэння беларускага кіно супаў з фіналам рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная кінапрэмія Беларусі».

Старшыня журы конкурсу загадчыца кафедры літаратурнамастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ кінакрытык Людміла Саянкова-Мельніцкая ўпачатку нагадала, што прэмія выспявала ў актыўных абмеркаваннях і спрэчках, і ў гэтай неабыякавасці таксама ёсць добры знак для беларускага кіно: «Кінапрэмія сапраўды патрэбна, таму што, з аднаго боку, будзе даваць стымул нашым кінематаграфістам, а з другога, аб'ядноўваць нас. Мне здаецца, што гэтая прэмія будзе жыць і заваёўваць аўтарытэт, калі здолее стаць максімальна справядлівай і сумленнай».

Сёлета на ўдзел у конкурсе паступіла 167 заявак. Па выніках першага тура было абрана 112 удзельнікаў. Але шмат хто адзначаў, што насамрэч колькасць фільмаў, якія былі зняты ў Беларусі за апошні час і маглі б разглядацца ў конкурсе, значна большая, як і большай магла б быць прысутнасць работ незалежных студый. А тое, што ў іх ёсць шанц быць заўважанымі і адзначанымі, цяпер зразумела. Першую ў гісторыі Нацыянальную прэмію за «Найлепшы іграві фільм» атрымала карціна незалежных кінастваральнікаў «Унутры сябе» (рэжысёр Сяргей Талыбаў).

Сваю кветку-прэмію ў намінацыі «Найлепшая рэжысёрская работа» атрымаў Аляксандр Анісімаў за фільм «Сляды на вадзе» (вытворчасць студыі «Беларусьфільм»). Стужка, што расказвае аб працы міліцыі ў пасляваенныя гады, стваралася ў складаных умовах, растлумачыў рэжысёр: усяго за чатыры месяцы, а кіно так здымацца не павінна. О цуд! Подзвіг здымачнай групы быў адзначаны: усяго 13 намінацый у першым рэспубліканскім конкурсе «Нацыянальная кінапрэмія Беларусі». У васьмі з іх мастацкі фільм адзначаны перамогамі. Акрамя рэжысёра, быў адзначаны Дзмітрый Рудзь — **«Найлепшая аператарская работа»**, і адразу два выканаўцы мужчынскіх роляў: Пётр Юрчанкоў за выкананне найлепшай галоўнай мужчынскай ролі адзначаны пасмяротна, Арцёма Курэня журы вылучыла ў намінацыі **«Найлепшы дэбют у кіно»**. Свае статуэткі атрымалі **мастак па касцюмах** у фільме «Сляды на вадзе» Наталля Сардарава, кампазітар Віктар Капыцько, што стварыў **музыку**. Вольга Рашэтнікава забяспечыла **найлепшы мантаж**, Уладзімір Сухадолаў стаў **найлепшым гукарэжысёрам**.

Рэжысёр Аляксандр АНІСІМАЎ атрымлівае ўзнагароду за стужку «Сляды на вадзе».

Фільм «Сляды на вадзе» магла паглядзець даволі шырокая аўдыторыя: яго паказвалі па тэлебачанні. Але за **найлепшы тэлесерыял у ігравой форме** прадугледжана асобная ўзнагарода, і яе атрымаў рэжысёр шматсерыйнага фільма «Ой, ма-мач-кі!-2» Іван Паўлаў, адзначыўшы, што кіно — гэта ўсё ж камандная гульня. Адным з асноўных гульцоў у гэтай камандзе стала артыстка Вера Палякова-Макей. Журы прысудзіла ёй нацыянальную прэмію за выкананне **найлепшай галоўнай жаночай ролі**.

Выканаўцу **найлепшай жаночай ролі другога плана** таксама заўважылі ў тэлесерыяле: Валянціна Гарцуева адзначана за працу ў фільме «Снайпер. Афіцэр СМЕРШ». Акцёр Віктар Васільеў, старшыня Саюза кінематаграфістаў Беларусі, атрымаў сваю статуэтку Нацыянальнай кінапрэміі Беларусі за **найлепшую мужчынскую ролю другога плана**, выкананую ў тэлефільме «Вокны дома твайго».

Узнагарода стваральнікам найлепшага іграваога фільма «Унутры сябе».

Сярод **кароткаметражных фільмаў** адзначаны «Апошні шанц» рэжысёра Ігара Васільева. З перамогай у намінацыі **«Найлепшы фільм у неігравой форме»** трэба віншаваць Настассю Мірашнічэнку, рэжысёра яшчэ адной незалежнай стужкі «Дэбют». Тры ўзнагароды атрымалі творцы-аніматары, прычым дзве з іх — у намінацыях, дзе канкурыраваць давялося з работамі як іграўымі, так і дакументальнымі. У выніку ўзнагарода за **найлепшы сцэнарый** — у Дзмітрыя Якутовіча за працу над стужкай «Баявая машына». **Найлепшую работу мастака-пастаноўшчыка** ўбачылі ў карціне «Марк Шагал. Пачатак», узнагароду атрымала Ала Мацюшэўская. **Найлепшым фільмам у анімацыйнай форме** прызнаны «Валчышка» рэжысёра Ігара Волчака: аднаго з мэтраў кіно зала вітала вельмі шчыра.

Як і тых, хто атрымліваў узнагароды за шматгадовую працу ў гонар айчыннага кіно. Як рэжысёр Валерый Рыбараў, якога адзначылі **за выдатны ўнёсак у беларускі кінематограф**. Што ёсць кіно як працукцыя і кіно як з'ява і на што здольнае кіно як мастацтва, разважаў народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін, атрымліваючы Нацыянальную кінапрэмію за **ўнёсак у замежны кінематограф**, падкрэсліўшы: кіно — гэта справа асоб, якія выкладваюцца як прафесіяналы і робяць гэта шчыра і сумленна. Калі ўсе складнікі збіраюцца, атрымліваецца кіно як з'ява. Якую ўсе так чакаюць у будучыні...

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

З нагоды

ЛЁС ЦЭЛАГА ПАКАЛЕННЯ!

Гэтымі днямі Беларускі саюз журналістаў святкуе 60-годдзе. Словы ўдзячнасці за шматгадовую прафесійную працу, узнагароды і кветкі, абдымкі і прывітанні старых сяброў, згадкі пра самыя складаныя часы і гонар за поспехі адно аднаго — вось толькі невялікія штрыхі да святкавання.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

З юбілеем творчы саюз павіншаваў Аляксандр Лукашэнка. Віншаванне зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Жаўняк.

На ўрачыстасці, якая адбывалася ў актавай зале Дома прэсы, не раз згадваліся складаныя часы, калі, здаралася, газеты выходзілі з рызыкай для жыцця тых, хто іх рабіў. Пра гэта нагадаў і **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Можна згадаць імя Уладзіміра Амельянюка, Міхаіла Барашкава ды многіх іншых рэдактараў, якія выпускалі газеты падпольна. А ўсяго ў нашай краіне ў час Вялікай Айчыннай вайны выходзіла 162 газеты — гэта ўнікальны факт. Наш супольны грамадскі творчы саюз — гэта арганізацыя, якая павінна кансалідаваць нас з усімі калегамі. А яшчэ, самае галоўнае — кансалідаваць вопыт грамадства ў дасягненні тых высокіх задач, якія павінны быць скіраваны на гуманітарнае развіццё нашай краіны, на той прагрэс, да якога імкнёмся, на ідэі міралюбства, якія прагучалі на самых розных мінскіх пляцоўках і былі пацверджаны не толькі словамі, але і канкрэтнымі дзеяннямі.

Старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль ЛЕМЯШОНАК *(на фота)* адзначыў:

— Для нас гэта прыгожая дата. На сённяшні дзень у Беларускім саюзе журналістаў 2268 сяброў. Гэта — моцная армія, эліта беларускай журналістыкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША прызналі безабароннасць перад гіпергукавой зброяй Расіі і Кітая

Злучаныя Штаты не валодаюць магчымасцямі для абароны ад гіпергукавой зброі, распрацоўку якой вядуць Расія і Кітай. Такая выснова змяшчаецца ў дакладзе галоўнага кантрольна-рэвізійнага органа Кангрэса ЗША — упраўлення па падсправаздачнасці ўрада, паведаміў тэлеканал Fox News. «Кітай і Расія вядуць работы па стварэнні гіпергукавой зброі, паколькі яе хуткасць, вышыня дзеяння і манеўранасць дазваляюць абысці большасць сістэм проціракетнай абароны і яна можа ўжывацца для ўзмацнення магчымасцяў нанясення ўдараў вялікай далёкасці з выкарыстаннем як звычайнага, так і ядзернага ўзбраення. Мер процідзеяння гэтаму цяпер няма», — адзначаецца ў справаздачы. Раней міністр абароны ЗША Джэймс Мэціс заяўляў, што распрацоўка гіпергукавой зброі і сродкаў абароны ад яе сталі для ўзброеных сіл ЗША на дадзеным этапе галоўным прыярытэтам. Пры гэтым кіраўнік Стратэгічнага камандавання ўзброеных сіл ЗША генерал Джон Хайт адзначаў, што Расія і Кітай апярэджваюць Злучаныя Штаты па шэрагу кірункаў распрацоўкі гіпергукавой зброі. У кастрычніку першы намеснік міністра абароны ЗША Патрык Шанахан паведаміў аб тым, што Злучаныя Штаты актыўна працуюць над стварэннем гіпергукавых узбраенняў і пачнуць праводзіць іх выпрабаванні хутчэй, чым таго можна было чакаць.

Складзены рэйтынг краін свету па ўзроўні дабрабыту

Эксперты кансалтынгавай кампаніі BCG склалі рэйтынг краін з самымі высокімі паказчыкамі індэкса дабрабыту па выніках 2018 года. Першае месца заняла Нарвегія з валавым нацыянальным даходам (ВНД) на душу насельніцтва 82 390 долараў. На думку экспертаў кампаніі, гэта скандынаўская дзяржава мае развітую змешаную эканоміку, паспяховую сельскую гаспадарку, вельмі высокі ўзровень жыцця ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі і прадуманую сістэму сацыяльнага забеспячэння, перадае vestifinance.ru. Другое месца ў Швейцарыі (ВНД — 81 240 долараў). З-за невялікай тэрыторыі краіны і высокай спецыялізацыі працы ключавымі эканамічнымі рэсурсамі тут з'яўляюцца прамысловасць і гандаль. Пры гэтым краіна — лідар па ачыстцы золата, а яе эканоміка — адна з найбольш стабільных у свеце. Замыкае першую тройку Ісландыя (ВНД — 56 790 долараў). У гэтай краіне актыўна развіваюцца біятэхналогіі, турызм, банкаўскі бізнес і інфармацыйныя тэхналогіі. Акрамя таго, адбываецца інтэнсіўная дыверсіфікацыя прамысловасці на аснове таннай аднаўляльнай энергіі. Таксама нядаўна ўрад Ісландыі абвясціў аб маштабнай праграме па будаўніцтве алюмініевых заводаў. У топ-10 краін свету з самым высокім дабрабытам таксама ўвайшлі Люксембург, Данія, Швецыя, Сінгапур, Фінляндыя, Аўстрыя і Нідэрланды.

Пекінскі Забаронены горад стаў самым наведвальным музеем свету

Забаронены горад, колішняя імператарская зімовая рэзідэнцыя, а цяпер комплекс Гугун («Старажытны палац»), стаў самым наведвальным музеем свету. Як паведаміла Цэнтральнае тэлебачанне Кітая, на мінулым тыдні ён прыняў 17-мільённага сёлетняга наведвальніка, што на 6,25 працэнта больш за паказчык мінулага года. Па даных адміністрацыі музея, найбольшую частку гасцей складаюць прадстаўнікі моладзі да 30 гадоў — да гэтай катэгорыі адносіцца каля 40 працэнтаў наведвальнікаў, яшчэ каля 24 працэнтаў прыпадае на людзей ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў. Забаронены горад абмежаваў максімальную колькасць наведванняў да 80 тысяч чалавек у дзень. Гэтая мера дзейнічае ўжо на працягу двух з паловай месяцаў для таго, каб гарантаваць захаванасць архітэктуры і экспанатаў музея. У гэтым годзе асаблівую папулярнасць сярод гасцей Забароненага горада набылі каты, якія жывуць на тэрыторыі імператарскай рэзідэнцыі. Па даных адміністрацыі, усяго палац насяляюць больш за 200 жывёл — яны выконваюць ролю своеасаблівых «наглядчыкаў», з якімі многія наведвальнікі любяць зрабіць памятнае сэлфі і выкласці фота ў сацыяльныя сеткі.